Швед, В.В. Расійскае біблейскае таварыства на Гродзеншчыне. Да гісторыі канфесійнай палітыкі царызму / В. В. Швед // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 80–84

***В. В. ШВЕД***

# РАСІЙСКАЕ БІБЛЕЙСКАЕ ТАВАРЫСТВА НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ. ДА ГІСТОРЫІ КАНФЕСІЙНАЙ ПАЛІТЫКІ ЦАРЫЗМУ

Думку аб стварэнні Расійскага біблейскага таварыства падалі агенты англійскага Біблейскага таварыства П. Пінкертон і Патэрсан. 6 (18).12.1812 г. Аляксандр І зацвердзіў усепадданейшы даклад галоўнага кіраўніка спраў замежных веравызнанняў князя А. М. Галіцына і праект арганізацыі ў Пецярбурзе Біблейскага таварыства паводле заходнееўрапейскага ўзору. У 1813 г. адчыніліся яго камітэты ў Маскве, Рэвелі, Яраслаўлі, Рызе, Дэрпце і іншых гарадах, а з 4(16).09.1814 г. яно стала Расійскім.

Бліжэйшай мэтаю Біблейскага таварыства было выданне кніг Старога і Новага Запавету для асоб неправаслаўнага насельніцтва Расіі («иностран-



ных исповеданий»), узмацненне і распаўсюджванне веры «для множання шчасця, дабрабыту, спакою ў свеце...». Канчатковай і ўзвышанай мэтай было распаўсюджванне сапраўднага хрысціянства, кіраванне ўсімі дзяржаўнымі і адукацыйнымі ўстановамі на евангелічных пачатках. Але назіраліся ў мэтах Біблейскага таварыства і рэакцыйныя рысы: яно павінна было выконваць праграму, якая была прынята Свяшчэнным саюзам — аб’яднаннем манархаў супраць «Князя цемры (ідал яго — розум чалавечы, які закрывае святло Хрыстова)». У адным з дакументаў таварыства гаварылася, што асвета вядзе да «самавольства, непадпарадкавання ўладзе, самім Богам на карысць грамадства ўсталяванай; бачым крамолы, бунты, міжусобіцы, забойствы, кроў, слёзы, рэкамі цякучыя...». Распаўсюджванне Бібліі і іншых кніг рэлігійнага зместу, чытанне іх павінна было адцягнуць увагу людзей ад рэвалюцыйных ідэй, нацыянальна-вызваленчага і антыўрадавага рухаў, дэмакратычных пераўтварэнняў у сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці краіны. Праз Біблейскае таварыства царызм ажыццяўляў ідэалагічнымі сродкамі нагляд за грамадскай думкай.

Грамадскае жыццё і самадзейнасць у Расіі першай чвэрці XIX ст. былі, па словах расійскага даследчыка Пыпіна, у стане маленства. Таму пры стварэнні камітэтаў Біблейскага таварыства абапіраліся на ўрадавыя структуры. Сярод іх былі асобы як «упэўненыя і шчыра аддадзеныя справе», так і тыя, хто «кідаўся выконваць тое, што было на той час прыемна трымаючым уладу...». Сярод кіраўнікоў Расійскага біблейскага таварыства былі ў канцы 1823 г. обер-пракурор Сінода князь А. М. Галіцын (прэзідэнт), Р. А. Кошалеў, графы У. П. Качубей і А. К. Разумоўскі (усе віцэ-прэзідэнты), мітрапаліты — Пецярбургскі Амвросій, Маскоўскі Філарэт, Кіеўскі Серафім, епіскапы — чарнігаўскі Міхаіл і цвярскі Серафім (усе святары — сябры камітэта). Ганаровым сябрам лічыўся імператар Аляксандр І. Ён уступіў у таварыства з аднаразовым узносам у 25 000 рублёў і штогадовым у 10 000 руб.

Структура Расійскага біблейскага таварыства складалася з цэнтральнага камітэта ў Пецярбурзе, мясцовых аддзяленняў (звычайна ў губернскіх гарадах), камітэтаў і сатаварыстваў. Восенню 1816 г. у Гродзенскую губерню з мэтай «падтрымаць віды і намеры таварыства» прыязджаў агент Брытанскага біблейскага таварыства П. Пінкертон. Яго намаганні падхапіў Ігнаці Эмануэл Ляхніцкі, выдаўца «Магнетычнага Дзённіка», масон.

Ёсць сведчанне, што ў лістападзе 1816 г. Гродзенскае аддзяленне Біблейскага таварыства ўжо існавала, і губернатар аддаў загад аб распаўсюджванні па паветах Кнігі для спісаў сяброў таварыства. Аднак, калі ў студзені 1828 г. Гродзенскае губернскае праўленне даручыла свайму саветніку Марціну Яварoўскаму і пісару гродзенскага гарадавога магістрата Антонію Жышкевічу



сабраць матэрыялы аб Гродзенскім біблейскім таварыстве, дык яны ўказалі іншую дату яго заснавання — 1817 г. Мелася на ўвазе арганізацыя камітэта — кіруючага органа Гродзенскага таварыства. Дакладна вядома, што 16 красавіка 1817 г. гродзенскі губернатар С. Ф. Урсын-Нямцэвіч лістом далажыў А. М. Галіцыну аб стварэнні Гродзенскага камітэта Расійскага біблейскага таварыства, за што атрымаў ад таго падзяку.

У гэты час сябрамі яго сталі: губернатар С. Ф. Урсын-Нямцэвіч, віцэ-губернатар М. Т. Бутаўт-Анджэйковіч, прэзідэнт Гродна Ф. Мучынскі, былы прэзідэнт горада К. Крэйбіх, старшыня першага

дэпартамента Л. Сухадольскі, паліцмайстар Высочын, дарадца М. Нечвалодаў, К. Марачэўскі, А. Сульвестровіч, С. Гоўвальд, І. Храптовіч, І.-Э. Ляхніцкі, Я. Румель і іншыя (у асноўным пералічаны толькі тыя, хто ўнёс самыя значныя ўступныя ўзносы). У лісце да уніяцкага мітрапаліта І. Булгака ад 11 лютага 1817 г. гродзенскі губернатар запрашаў яго стаць віцэ-прэзідэнтам Гродзенскага біблейскага таварыства. Невядома, ці згадзіўся ён на гэтую прапанову. 12 сакавіка 1820 г. адбыліся апошнія выбары ў Гродзенскі камітэт. Яго сябрамі сталі: гродзенскі губернатар М. Анджэйковіч (віцэ-прэзідэнт), Сухадольскі (дырэктар), дарадцы Нечвалодаў, Маліноўскі, Крыдзель, паліцмайстар Высочын, губернскі казначэй Фамінскі, тытулярны дарадца М. Вітаноўскі (сакратар), калежскі сакратар Ю. Нелюбовіч (касір).

Агульная колькасць сяброў Гродзенскага біблейскага таварыства была падлічана намі па захаваных спісах Гродзенскага, Ваўкавыскага, Навагрудскага і Пружанскага паветаў. У кожным з іх спачатку прыводзіліся прозвішчы 61 чалавека, якія запісаліся ў таварыства ў Гродне, а толькі потым уступілі на месцы. Усяго налічвалася 81 чалавек, з іх: 61 па Гродзенскім павеце, 16 — па Пружанскім, 4 — па Ваўкавыскім і ніводнага па Навагрудскім.

У архіўных справах захаваўся праект Статута аддзялення Расійскага біблейскага таварыства, адпаведна з якім дзейнічала і Гродзенскае аддзяленне. Яно павінна было «дапамагаць Расійскаму біблейскаму таварыству ў яго справе, гэта значыць у імкненні прыводзіць у большае карыстанне Біблію або кнігі Святога Пісання (Старога і Новага Запавету), без якіх-небудзь тлумачэнняў і каментараў». Для сваёй дзейнасці аддзяленне стварае камітэт, які павінен распаўсюджваць рэлігійныя кнігі на тых мовах, на якіх размаўляюць жыхары губерні рознага веравызнання, хаця б і нехрысціяне, збіраць узносы на іх набыццё. Камітэт збіраецца на свае пасяджэнні адзін раз у месяц. У пачатку студзеня сябры Біблейскага таварыства збіраюцца на генеральны сход, на якім заслухоўваецца справаздача камітэта. Апошняя пасы-



лаецца ў Пецярбургскі камітэт. Сакратар камітэта павінен быў весці журнал пасяджэнняў, казначэй — фінансавыя запісы і разлікі.

З Пецярбурга для камітэта Гродзенскага біблейскага таварыства была дастаўлена пячатка для пакетаў, лістоў, пасылак. У цэнтры яе была выява Бібліі, вакол сонечныя прамяні і па крузе надпіс: «пячатка ... расійскага біблейскага таварыства». Карэспандэнцыя, завераная такой пячаткай, лічылася казённай і прымалася на пошце бясплатна.

Сувязь з Пецярбургам Гродзенскае аддзяленне Біблейскага таварыства падтрымлівала пастаянна. Адтуль прысылалася патрабуемая колькасць Біблій і розная рэлігійная літаратура. Так, ужо пры стварэнні бібліятэка Гродзенскага таварыства атрымала Біблію на 9 мовах, Новы Запавет на 18 мовах, нават Евангелле на калмыцкай мове, толькі не было сярод гэтых кніг літаратуры на беларускай мове, хаця ў мэтах Біблейскага таварыства было распаўсюджванне Бібліі на «родных мовах» насельніцтва. Дзейнасць гродзенцаў курыраваў сябра Пецярбургскага камітэта А. Тургенеў.

Галоўным у дзейнасці Гродзенскага аддзялення Біблейскага таварыства было распаўсюджванне Старога і Новага Запавету. З 1817 г. па 1824 г. з Пецярбурга прыслалі ў Гродна 253 кнігі на розных мовах (славянскай, нямецкай, французскай, польскай і інш.). З іх 43 пакінулі ў бібліятэцы камітэта, а астатнія размеркавалі наступным чынам: 35 выслалі павятовым маршалкам Навагрудскага, Слонімскага, Лідскага, Кобрынскага, Ваўкавыскага паветаў і 13 — генерал-маёру Патулаву, які ў Брэсце стварыў свой камітэт; раздалі бясплатна — 20 штук яўрэям, 2 арыштантам гродзенскай турмы, 34 кнігі бедным; прадалі камітэтам таварыства 54 кнігі. На момант закрыцця ў Гродзенскім аддзяленні засталося 95 кніг.

Для сваёй дзейнасці сябры Біблейскага таварыства збіралі ўзносы. За 1817—1820 гг. у касу Гродзенскага камітэта паступіла грашовых ахвяраванняў на суму 1 чырвонец 4 руб. 50 кап. серабром і 1244 руб. асігнацыямі. Акрамя таго, было атрымана ад продажу кніг 226 руб. 50 кап. асігнацыямі. З гэтых сум 1000 руб. выслалі ў Пецярбург, а 74 руб. 92 3/4 кап. патрацілі на свае патрэбы.

У дзейнасці Гродзенскага аддзялення Біблейскага таварыства адчуваўся значны польскі ўплыў. Так, аналіз кніг для спісаў сяброў таварыства паказвае, што большасць іх была палякамі, спісы прозвішчаў па-руску — рэдкасць. Уся дакументацыя (спісы, ведамасці аб прыходзе і расходзе рэлігійных кніг, кніга аб паступленні і выдатках грошай і інш.) вялася на польскай мове. Большасць прысылаемых Біблій была на польскай мове. Распаўсюджванне яе суправаджалася адкрыццём народных школ, у якіх вучылі чытаць



Біблію і малітоўнікі на польскай мове. Створанае Варшаўскае (Польскае) біблейскае таварыства падтрымлівала шчыльныя кантакты з Гродзенскім камітэтам. Яно заклікала яго сяброў чытаць Біблію ў нядзелю і святы ў сямейным коле, разам з чэляддзю, служачымі, што «памножыць колькасць карысных

дамовых інстытутаў, якія з'яўляюцца найпярвейшымі гарантыямі звычаяў». Біблію ў перакладзе Кс. Вуйка («забытка з часоў квітнеючай польскай мовы») меркавалі надрукаваць у гродзенскай друкарні дамініканаў, што «будзе мець выратавальны ўплыў на карэннае ўдасканальванне роднай мовы».

Гісторыя Расійскага біблейскага таварыства аказалася даволі кароткай. 15 (27) ліпеня 1826 г. выйшаў імянны ўказ на імя мітрапаліта Серафіма аб яго закрыцці. Працы ж таварыства спыніліся яшчэ раней — да канца 1824 г. У рэскрыпце імператара Мікалая I аб спыненні дзейнасці Расійскага біблейскага таварыства ад 12 (24) красавіка 1826 г. загадвалася правесці інвентарызацыю рухомай і нерухомай маёмасці таварыства, а таксама яго наяўных капіталаў. Кнігі Святога Пісання дазвалялася «працягваць прадаваць жадаючым па вызначаных коштах».

Гродзенскае таварыства атрымала копію вышэйназванага рэскрыпта і таксама спыніла сваю дзейнасць. Наяўныя грошы ў суме 1 чырвонца 8 руб. 40 кап. серабром і 664 руб. 67 кап. былі здадзены архіепіскапу Мінскаму і Літоўскаму Анатолю, кнігі — у гродзенскі Сафійскі сабор В. Папову, справы — у губернскае праўленне.

Закрыццё Біблейскага таварыства стала вынікам вострай барацьбы дзвюх рэакцыйных груповак унутры кіруючых вярхоў і духавенства з-за метадаў і зместу рэлігійнага ўплыву на народныя масы. Супраць А. Галіцына і яго паплечнікаў выступілі А. Аракчэеў, архімандрыт Фоцій, мітрапаліты Серафім і Яўген. Не падабалася праціўнікам Біблейскага таварыства і тое, што яно скацілася да містыцызму і абскурантызму. Міністр народнай адукацыі і духоўных спраў Шышкоў папярэджваў Аляксандра I: «Чытанне святых кніг у тым, каб ліквідаваць прававернасць, узбунтаваць айчыну і зрабіць у ім міжусоб'е і бунты», «змяінае джала схавана прыстойнымі кветкамі».

Такім чынам, гісторыя Гродзенскага аддзялення Расійскага біблейскага таварыства паказвае, што расійскі ўрад хацеў выкарыстаць яго для духоўнага прыгнёту беларускага насельніцтва. Каталіцкае мясцовае кіраўніцтва выкарыстала Біблейскае таварыства для ўтрымання польскасці сярод жыхароў губерні.